Іванкаўшчыны, працаваў лесніком у Мазырскім лясгасе, быў у ліку лепшых. Наведваўся і на сваю далёкую радзіму — Славакію. Але цягнула на новую... Памёр Іван Іванавіч у кастрычніку 1978 г.

На новай радзіме, за якую ён ваяваў, якая стала яму па-сапраўднаму роднай, на якой, нарэшце, вырасціў дзяцей, яго памятаюць, часта ўспамінаюць Яна добрымі словамі баявыя сябры і жыхары Мазыршчыны.

*І. Цітоў*

## Жыхары Мазыршчыны, якія змагаліся ў партызанскіх атрадах і загінулі на тэрыторыі раёна і за яго межамі

Архівы Мінска, Кіева і Кішынёва даюць дакладныя звесткі аб удзеле жыхароў Мазыршчыны ў масавым партызанскім руху. Так, у Мазырскай партызанскай брыгадзе імя Аляксандра Неўскага з 500 чалавек каля 400 былі жыхарамі горада і раёна. 250 чалавек ваявалі ў Петрыкаўскай брыгадзе, 100 — у Ельскай, нямала мазыран былі партызанамі і ў суседніх раёнах...

19 лістапада 1942 года на Мазыршчыну ў раёне вёсак Аравічы — Барбароў цераз Прыпяць пераправіліся ўкраінскія партызанскія злучэнні С. Каўпака, А. Сабурава і А. Фёдарава. Прыбыццё на беларускае Палессе значна ўмацавала іх сілы. У злучэнне А. Сабурава пайшлі ваяваць 300 жыхароў Мазыршчыны, А. Фёдарава — каля 100, С. Каўпака — больш за 50 чалавек. Некалькі дзесяткаў чалавек былі байцамі Вінніцкага і Ровенскага злучэнняў. Вясной 1943 г. тут, у лясах Палесся, фарміравалася і 1-е Малдаўскае партызанскае злучэнне, дзе толькі з двух сельсаветаў раёна, Асавецкага і Скрыгалаўскага, ваявала больш як 100 чалавек. Маюцца звесткі аб удзеле мазыран у партызанскай барацьбе ў Карэліі, Смаленскай, Бранскай, Чарнігаўскай і іншых абласцях. Вядомы імёны каля 250 жыхароў горада і раёна, якія загінулі ў баявых дзеяннях лясной арміі. Толькі на тэрыторыі раёна загінула і пахавана больш як 50 партызан з украінскіх і беларускіх атрадаў, у тым ліку з Мазырскай брыгады імя А. Неўскага — 25 чалавек.

### ГОРАД МАЗЫР

**АРЦЁМАЎ Аркадзь П.,** н. у 1918, партызан 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 25.10.1943 у в. Заходы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

**ДУЛУБ Рыгор Васілевіч,** н. у 1924, партызан, павешаны 10.8.1943 у г. Мазыр.

**КАЗАЧУК Яўген Іванавіч,** партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў г. Хойнікі.

**КАРАСЁЎ Даніла Лазаравіч,** н. у 1911, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 4.7.1943, пахаваны ў в. Раманаўка Мазырскага р-на.

**КРЫЖАНОЎСКІ Антон Яўхімавіч,** н. у 1891, партызан, памёр ад хваробы 10.10.1943 у в. Глазкі Ельскага р-на Гомельскай вобл.

**КУЗМЯНЮК Лука Дзямідавіч,** н. у 1918, партызан 101-й Даманавіцкай брыгады, загінуў 15.9.1943 у в. Узнаж Гомельскай вобл.

**ЛЯЎКО Васіль Рыгоравіч,** н. у 1919, намеснік камандзіра атрада 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 25.3.1944 у в. Хвойнае Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

**МАКАРАНКА Максім Ігнатавіч,** сакратар Мазырскага райкама КП(б)Б, камандзір Мазырскага партызанскага атрада ў жніўні — кастрычніку 1941, загінуў у 1943 у Магілёўскай вобл.



Я. І. Казачук



Д. Л. Карасёў



Р. А. Чавус



З. А. Пашак

**СТАЧЫНСКІ Фёдар Ільіч,** н. у 1909, камандзір аддзялення атрада імя М. Хрушчова, загінуў 1.4.1944 у в. Радаўніца Львоўскай вобл.

**СЧАСЛАЎСКІ Пётр Ігнатавіч,** камісар Мазырскага атрада ў жніўні – кастрычніку 1941, загінуў 16.5.1944 у Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл.

**ТАЛКАЧОЎ Яўген Іосіфавіч,** н. у 1924, камандзір узвода 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 16.9.1942 у в. Аўцюкі Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

**ЦІТАВЕЦ Альберт Уладзіміравіч,** н. у 1924, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак 25.1.1943.

**ЧАВУС Рыгор Антонавіч,** н. у 1912, ст. лейтэнант, начальнік штаба партызанскага атрада імя Варашылава, загінуў 17.9.1942 у Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл.

**ШКАРАДЗІК Ян Янавіч,** н. у 1918, партызан, загінуў у сакавіку 1943 у в. Нахаў Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

## АСАВЕЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА АСАВЕЦ

**ВАСКЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч,** н. у 1906, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 27.3. 1944 у в. Яварнік Валынскай вобл.

**КАНАВАЛЬЧУК Піліп Аўксенцьевіч,** н. у 1911, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 27.3.1944 у в. Яварнік Валынскай вобл.

**РАБІНСКІ Нікіфар Піліпавіч,** н. у 1902, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 23.9.1943 у в. В. Студзень Ровенскай вобл.

**СЕЛЬВІЧ Васіль Сяргеевіч,** н. у 1922, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 17.7. 1943 у в. Чырванаволе Ровенскай вобл.

### ВЁСКА АСАВЕЦКАЯ БУДА

**КОРЖ Тарас Якаўлевіч,** н. у 1925, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў у чэрвені 1944 у Брэсцкай вобл.

**СТАНКЕВІЧ Кандрат Данілавіч,** н. у 1903, партызан злучэння А. Сабурава, з 1944 – у органах НКУС, загінуў у баі з нацыяналістамі ў 1945 у Хмяльніцкай вобл.

### ВЁСКА ГІНЕВІЧАЎ ГРУД

**БЫЧКОЎСКІ Міхаіл Лаўрэнцьевіч,** н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943 у Жытомірскай вобл.

**ПАШАК Зыгмунд Андрэевіч,** н. у 1903, камандзір аддзялення партызанскага атрада імя Катоўскага 1-га Малдаўскага злучэння, загінуў 18.11.1943 у в. Беразнякі Жытомірскай вобл.

**ХАДАКОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у чэрвені 1943 у в. Залавы Ракітнянскага р-на Ровенскай вобл.

### ВЁСКА ГЛІНІЦА

**ВАСКЕВІЧ Васіль Кузьміч,** н. у 1926, партызан, прапаў без вестак у 1944.

**ВАСКЕВІЧ Васіль Сцяпанавіч,** н. у 1897, партызан, прапаў без вестак у 1944.

**ВАСКЕВІЧ Мікалай Васілевіч,** н. у 1923, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі.

**ВАСКЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч,** н. у 1898, партызан, прапаў без вестак у 1943.

**ВАСКЕВІЧ Нікіфар Іванавіч,** н. у 1923, партызан 1-га Малдаўскага злучэння, прапаў без вестак у 1944 у Вінніцкай вобл.

**ВЫСОЦКІ Міхаіл Паўлавіч,** н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.5. 1944 у Заходняй Украіне.

**ЖУКАВЕЦ Іван Калінікавіч,** н. у 1920, партызан 1-га Малдаўскага злучэння, загінуў у кастрычніку 1943 у Цярнопальскай вобл.

**МАКАРАВЕЦ Захар Пятровіч,** н. у 1898, партызан, расстраляны ў 1943, пахаваны ў в. Асавец.

**ФІЦНЕР Іван Адамавіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў у 1943.

**ЦАЛКА Яўхім Міхеевіч,** н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Уладзіміраўка Ровенскай вобл.

### ГЛІНІЦКІ ПАСЁЛАК

**ВАСКЕВІЧ Міхаіл Аксёнавіч,** н. у 1923, партызан 136-га атрада Петрыкаўскай брыгады, памёр ад ран у 1943.

### ВЁСКА ЗІМАВАЯ БУДА

**РЭВУТ Нікадзім Лявонавіч,** н. у 1923, партызан 1-га Малдаўскага злучэння, прапаў без вестак у 1944 у Вінніцкай вобл.

## ВЁСКА КАМЕНЬ

**ВАСКЕВІЧ Васіль Кузьміч,** н. у 1926, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак у 1943.

## ВЁСКА КРУШНІКІ

**ЗДАНЕВІЧ Аляксей Францавіч,** н. у 1908, старшыня калгаса, партызан Вінніцкага злучэння, прапаў без вестак у 1943.

**ЗДАНЕВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч,** н. у 1903, партызан Вінніцкага злучэння, памёр ад ран 12.8.1944.

**КАШАЕД Аляксандр Уладзіміравіч,** н.у 1921, партызан Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у Хмяльніцкай вобл.

**КАШАЕД Пётр Францавіч,** н. у 1924, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у в. Чамярыўцы Хмяльніцкай вобл.

**КАШАЕД Фабіян Мікалаевіч,** н. у 1910, партызан Вінніцкага злучэння, прапаў без вестак у верасні 1943.

**КРУПА Лявон Казіміравіч,** н. у 1923, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у Хмяльніцкай вобл.

**ПАШАК Іван Яўхімавіч,** н. у 1918, партызан Ровенскага злучэння, загінуў 28.7.1943 у в. Чамярыўцы Хмяльніцкай вобл.

**ФІЦНЕР Уладзімір Іванавіч,** н. у 1920, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у Хмяльніцкай вобл.

**ЮНІЦКІ Аляксандр Іванавіч,** н. у 1921, партызан атрада «Чырвоны» Вінніцкага злучэння, загінуў 28.7.1943 у в. Чамярыўцы Хмяльніцкай вобл.

## ВЁСКА КРЫНІЧНАЯ ГРАДА

**БАГІНСКІ Уладзімір Эдуардавіч,** н. у 1927, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў пры размініраванні.

## ВЁСКА ПЕРАДРЭЙКА

**ЖУРАЎСКІ Андрэй Філарэтавіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак восенню 1943.

**ЖУРАЎСКІ Мікалай Лукашавіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак у 1944 у Ровенскай вобл.

**ЖУРАЎСКІ Сцяпан Мікалаевіч,** н. у 1904, партызан 130-й Петрыкаўскай брыгады, загінуў 3.11.1943 каля в. Конкавічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

**КОРЖ Тарас Якаўлевіч,** н. у 1925, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 3.11.1943 у в. Машчаніда Цуманскага р-на Ровенскай вобл.

Т. Я. Корж



**СЕМЕЧКА Уладзімір Сцяпанавіч,** н. у 1925, партызан злучэння А. Фёдарава, прапаў без вестак у 1943.

**ШЛЯГА Мікалай Паўлавіч,** н. у 1926, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 6.11.1943 у в. Берасняны Цуманскага р-на Ровенскай вобл.

## ВЁСКА СКАЛОДЗІН

**СЯЎРУК Арсен Мікалаевіч,** партызан, загінуў у 1943.

**ЦАЛКА Сцяпан Ніканавіч,** партызан, загінуў у 1943.

**ЦАЛКА Уладзімір Сцяпанавіч,** н. у 1905, партызан, загінуў у 1943 каля в. Астражанка Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

## ВЁСКА ТУРБІНКА

**ВАНЬКОВІЧ Уладзімір Сямёнавіч,** н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Польшчы.

# БАРБАРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

## ВЁСКА ГОРНАЯ

**ЗАЙЦАЎ Васіль Лук'янавіч,** н. у 1924, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 9.2.1943 у Жытомірскай вобл.

## ПАСЁЛАК ПЕРАДАВЫ

**КУНЕЦ Пётр Клімавіч,** н. у 1914, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у снежні 1942.

**ПАПОК Ілья Міхайлавіч,** н. у 1915, камандзір аддзялення злучэння С. Каўпака, загінуў 3.3.1944 у в. Дамбровіца Валынскай вобл.

## ПАСЁЛАК ПРАГРЭС

**КУНЕЦ Пётр Арцёмавіч,** н. у 1915, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у 1943.

## КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА АНТОНАЎКА

**ГАРМОНЕНКА Васіль Сямёнавіч,** н. у 1925, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 16.11.1943 каля г. Оўруч Жытомірскай вобл.

### ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

**ГУЛІК Павел Мікалаевіч,** н. у 1916, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у верасні 1943 пры мініраванні чыгункі.

### ВЁСКА ВАСЬКАЎКА

**БАКУН Фёдар Іванавіч,** н. у 1921, член Мазырскай падпольнай арганізацыі і партызан у 1941—1942, расстраляны ў чэрвені 1942.

**ІЛЬЮК Міхаіл Мацвеевіч,** н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 каля г. Высоцк Ровенскай вобл.

**КАДОЛ Сцяпан Лявонавіч,** н. у 1900, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у студзені 1944 каля г. Мазыр.

**РЫМША Ганна Іванаўна,** н. у 1908, партызанка Мазырскага атрада ў 1941, расстраляна ў кастрычніку 1942.

**САЧУК Павел Нікадзімавіч,** н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

### ВЁСКА ГОСТАЎ

**АЎДЗЯЙЧУК Іван Антонавіч,** н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

**ДАНІЛЬЧАНКА Уладзімір Андрэевіч,** н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943 у Заходняй Украіне.

**МАЗУРКЕВІЧ Пелагея Рыгораўна,** н. у 1903, расстраляна з малым дзіцём у 1943 за сувязь з партызанамі.

**ШУЛЯРЭНКА Іван Захаравіч,** н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.8. 1943, пахаваны ў в. Даўгань Ровенскай вобл.

**ШУЛЯРЭНКА Павел Захаравіч,** н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

### ВЁСКА ІВАНКАЎШЧЫНА

**ПАТАПЕНКА Фёдар Давыдавіч,** н. у 1910, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 21.12.1943.

**СУХАНІЦКІ Васіль Рыгоравіч,** н. у 1926, партызан, прапаў без вестак у 1945.



Ф. Д. Патапенка



В. Ф. Нягрэй

### ВЁСКА КАМЕНКА

**АНТОНЕНКА Іван Рыгоравіч,** н. у 1910, старшыня калгаса ў в. Каменка, партызан Мазырскага атрада і злучэння С. Каўпака, загінуў у 1943 у Кіеўскай вобл.

**НЯГРЭЙ Вольга Фёдараўна,** н. у 1920, член Мазырскай падпольнай арганізацыі, сувязная партызанскага атрада, расстраляна ў лістападзе 1943.

**УЛАСЕНКА Мікалай Філімонавіч,** н. у 1904, член Мазырскай падпольнай арганізацыі, затым партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 18.3.1943 у Кіеўскай вобл.

### ВЁСКА МЯЛЕШКАВІЧЫ

**БАКУН Іван Антонавіч,** н. у 1909, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 18.4.1943 каля в. Слабада.

**ВОЎК Іван Іосіфавіч,** н. у 1907, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Брэсцкай вобл.

**ДУБАВЕЦ Мікалай Адамавіч,** н. у 1910, партызан Мазырскага атрада, расстраляны 8.1. 1942 у г. Мазыр.

**ЖЫЛЬСКІ Ігнат Міхайлавіч,** н. у 1922, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у 1943.

**ЖЫЛЬСКІ Сцяпан Міхайлавіч,** н. у 1920, партызан атрада імя Багдана Хмяльніцкага Ровенскага злучэння, загінуў у 1944 у в. Грамячы Ровенскай вобл.

**ЗАХАРАНКА Яўсей Рыгоравіч,** н. у 1915, партызан Мазырскага атрада, загінуў 13.7.1943.

**ЗДРОК Кірэй Якімавіч,** н. у 1904, старшыня калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 23.12.1943.

**ЗЯНКЕВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч,** партызан, загінуў у студзені 1944 у Жытомірскай вобл.

**КАЧЭНЯ Кірыла Ерамеевіч,** н. у 1903, партызан, расстраляны ў 1943.

**ЛУЗАН Павел Максімавіч,** н. у 1919, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад ран 20.1.1944.

**ПЯТРОЎСКІ Іван Фёдаравіч,** н. у 1916, настаўнік, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад хваробы 6.1. 1944.

**СУХАНІЦКІ Якаў Паўлавіч,** н. у 1916, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 12.4. 1945 у баі з украінскімі нацыяналістамі ў Львоўскай вобл.

**УРЭЦКІ Хонан Айзікавіч,** н. у 1904, старшыня калгаса, партызан Мазырскага атрада, расстраляны 8.1.1942.

## КОЗЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА БУЛАЎКІ

**ФЕДАРЭНКА Аляксей Іванавіч,** н. у 1907, працаваў старшынёй сельсавета, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у 1943.

### ВЁСКА ДРАЗДЫ

**РУДЗІНСКІ Антон Феліксавіч,** н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак 12—13 студзеня 1944 у баі за Мазыр.

### ВЁСКА КОЗЕНКІ

**БЕЛЫ Пётр Сямёнавіч,** н. у 1915, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 31.12.1943.

## КРЫНІЧАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА БІБІКІ

**ДУБРОВА Дзмітрый Калінікавіч,** н. у 1906, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.11. 1943 у Жытомірскай вобл.

**ДУБРОЎСКІ Ілья Адамавіч,** партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 25.12.1942 у Жытомірскай вобл.

**ЗУБАР Купрыян Данілавіч,** н. у 1913, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

**ЛЕВАНЧУК Рыгор Якаўлевіч,** н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 8.4. 1944 у в. Падкамень Львоўскай вобл.

**МАЙСЕЕНКА Яўхім Кірылавіч,** партызан злучэння С. Каўпака, загінуў 15.3.1943 у Жытомірскай вобл.

**СЕМЯНЕНКА Аляксандр Фёдаравіч,** н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у студзені 1943.

**ЯРАШ Нікіфар Канстанцінавіч,** н. у 1913,



А. Ф. Семяненка



Н. К. Ярош



М. П. Гарбарчук



П. К. Гурын

партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

### ВЁСКА ГУРЫНЫ

**ГАРБАРЧУК Мікалай Паўлавіч,** н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 24.11. 1942 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

**ГУРЫН Павел Ксенафонтавіч,** н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 24.11. 1942 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

**МАРДУСЕВІЧ Аляксандр Рыгоравіч,** н. у 1896, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 30.4.1944 у Валынскай вобл.

**МАРДУСЕВІЧ Браніслаў Антонавіч,** н. у 1905, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Заходняй Украіне.

**САСНОВІЧ Іван Іосіфавіч,** н. у 1918, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 24.11. 1942 у в. Скароднае Ельскага р-на Гомельскай вобл.

**ФЕШЧАНКА Мікалай Фёдаравіч,** н. у 1907, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у кастрычніку 1942.



А. Р. Мардусевіч



Б. А. Мардусевіч

### ХУТАР МОЛАЖАВА

**КРАЎЧАНКА Рыгор Андрэевіч,** н. у 1915, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943.

## МАХНАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ

**ГАЙДУК Якаў Іосіфавіч,** н. у 1913, партызан Ельскай брыгады, загінуў 29.11.1943 у г. Ельск Гомельскай вобл.

**КАНОПЛІЧ Рыгор Паўлавіч,** партызан Махнавіцкага атрада ў жніўні – кастрычніку 1941, расстраляны ў красавіку 1942.

**ХАРЛАНЧУК Пётр Фёдаравіч,** н. у 1910, партызан Ельскай брыгады, загінуў 10.7.1943.

### ВЁСКА ЗАВОДНЫ ВОСТРАЎ

**КАСЦЮКЕВІЧ Ганна Антонаўна,** н. у 1916, партызанка Ельскай брыгады, прапала без вестак 20.7.1943.

**КАСЦЮКЕВІЧ Марыя Антонаўна,** н. у 1923, працавала настаўніцай, партызанка Ельскай брыгады, загінула 27.7.1943, пахавана ў в. Вярхі Ельскага р-на Гомельскай вобл.

**ЛІТВІНЧУК Андрэй Віктаравіч,** н. у 1912, партызан Ельскага атрада, загінуў 1.1.1943.

**ЛІТВІНЧУК Якаў Андрэевіч,** н. у 1898, партызан, загінуў зімой 1941 у в. Новы Славечанскага р-на Жытомірскай вобл.

**СТАРАВОЙТ Аляксандр Дзям'янавіч,** н. у 1919, партызан Ельскай брыгады, загінуў 29.11. 1943 у г. Ельск Гомельскай вобл.

### ВЁСКА ЗЯЛЁНЫ МОХ

**ЖУРАЎСКІ Сямён Станіслававіч,** н. у 1898, старшыня калгаса ў в. Махнавічы, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны ў 1942.

### ВЁСКА МАХНАВІЧЫ

**ЗАЯЦ Іван Еўдакімавіч,** н. у 1921, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

**ЗАЯЦ Павел Якаўлевіч,** н. у 1916, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 5.1.1945 у баі з нацыяналістамі ў пас. Тарчын Ровенскай вобл.

**ЗАЯЦ Пііп Міхайлавіч,** н. у 1914, партызан злучэння С. Каўпака, прапаў без вестак у ліпені 1943.

**КАНОПЛІЧ Апанас Дзмітрыевіч,** н. у 1912, старшыня Махнавіцкага сельсавета, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

**КАНОПЛІЧ Іван Дзям'янавіч,** н. у 1902, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

**КАНОПЛІЧ Рыгор Калінікавіч,** н. у 1893, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

**КАНОПЛІЧ Сцяпан Дзям'янавіч,** н. у 1904, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны 14.3.1942.

### ВЁСКА ПАДЛЯДЗІЧЫ

**КАНОПЛІЧ Мікалай Максімавіч,** н. у 1912, партызан Ельскай брыгады, загінуў 8.1. 1944 у в. Рамязы Ельскага р-на Гомельскай вобл.

**КАНОПЛІЧ Фёдар Архіпавіч,** партызан, прапаў без вестак у 1943.

**СТЭЦКІ Васіль Фёдаравіч,** н. у 1904, партызан Махнавіцкага атрада, расстраляны ў 1941.

## МІХАЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА КУСТАЎНІЦА

**ДЗЕРАНГОЎСКАЯ Ірына Антонаўна,** н. у 1919, студэнтка Маскоўскага медыцынскага інстытута, у 1942 у складзе разведвальнай групы накіравана ў тыл ворага і прапала без вестак.

**ШАРАЙ Адам Іосіфавіч,** н. у 1919, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

**ШАРАЙ Мікалай Пятровіч,** н. у 1915, настаўнік, палітрук роты Лельчыцкай партызанскай брыгады, загінуў 15.7.1943, пахаваны ў в. Стадолічы Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

### ВЁСКА МАЛЫ БАКАВЕЦ

**АНТОНЕНКА Іван Рыгоравіч,** н. у 1902, партызан, памёр ад ран 5.2.1943, пахаваны ў Маскве на Прэабражэнскіх могілках.

**ЧЫРЭЦ Іван Апанасавіч,** н. у 1915, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Польшчы.



І. А. Чырэц



М. У. Андрыеўскі



П. М. Бандарэнка



А. П. Тарасаў

### ВЁСКА МІХАЛКІ

**АНДРЫЕЎСКІ Мікалай Уладзіміравіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 27.11.1942, пахаваны ў в. Капішчы Алеўскага р-на Жытомірскай вобл.

**БАНДАРЭНКА Пілiп Мікалаевіч,** н. у 1910, старшыня роты партызанскага злучэння А. Сабурава, загінуў 7.5.1944, пахаваны ў в. Ястмэмбіца Ровенскай вобл.

**ТАРАСАЎ Аляксандр Паўлавіч,** н. у 1917, камандзір разведкі партызанскага атрада брыгады імя М. В. Фрунзе, загінуў 5.8.1943.

### ВЁСКА ПРАЎЦЮКІ

**АСТРОЎСКІ Пётр Сцяпанавіч,** н. у 1920, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў у 1943 у Кіеўскай вобл.

**ДОРДАЛЬ Мікалай Цярэнцьевіч,** н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1942.

**ЖОЛУДЗЬ Міхаіл Васілевіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Ровенскай вобл.

**ЖОЛУДЗЬ Міхаіл Піліпавіч,** н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 27.10. 1943 у Кіеўскай вобл.

**ЗУЕЎ Андрэй Кузьміч,** н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1943 у Ровенскай вобл.

**ТАКВЕЛЬ Іван Кандратавіч,** н. у 1915, партызан Ровенскага злучэння, памёр ад ран 28.12.1943 у в. Навасёлкі Марачаўскага р-на Ровенскай вобл.

## ПРУДКОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА ЗАГОРЫНЫ

**ГАРЛЕВІЧ Рыгор Андрэевіч,** н. у 1898, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, расстраляны ў 1943.

**МАСПАН Сцяпан Фёдаравіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 16.11.1943, пахаваны ў в. Палахачаў Оўручскага р-на Жытомірскай вобл.

**СІКОРСКІ Ісак Аляксеевіч,** н. у 1894, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у студзені 1944.

### ВЁСКА МЕРАБЕЛЯ

**ЛУК'ЯНОВІЧ Захар Іосіфавіч,** н. у 1901, старшыня Прудкоўскага сельсавета, партызан Мазырскага атрада і ўдзельнік падполля, расстраляны 30.8.1942, пахаваны ў двары школы № 4 г. Мазыр.

### ВЁСКА ПРУДОК

**КАШПЕЙ Аляксандр Гаўрылавіч,** н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 каля г. Роўна.

**ЛЕПЕШ Павел Іларыёнавіч,** н. у 1915, партызан, прапаў без вестак 4.6.1944.

**ЛЯВОНАЎ Карп Яўціхіевіч,** н. у 1910, старшыня калгаса ў в. Раманаўка, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў 1942 у г. Мазыр.

**МІСЕВІЧ Максім Ігнатавіч,** н. у 1920, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад хваробы ў 1944.

### ВЁСКА РЭДЗЬКА

**ДУБАВЕЦ Гаўрыла Аляксандравіч,** н. у 1903, старшыня сельсавета, затым калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у 1943.



Г. А. Дубавец

## СКРЫГАЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА БАЛАЖЭВІЧЫ

**ДАМАСЕВІЧ Пётр Трафімавіч,** н. у 1926, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў 18.3. 1944 у в. Яварнік Львоўскай вобл.

**СУЛКОЎСКІ Іван Фёдаравіч,** партызан 1-га Малдаўскага злучэння, загінуў 20.2.1944 у Цярнопальскай вобл.

**ШАСТАВЕЦ Кузьма Апанасавіч,** н. у 1923, партызан злучэння А. Фёдарава, загінуў у 1944 у Заходняй Украіне.

### ВЁСКА БЕЛАЯ

**ВЯРАКСІЧ Гаўрыла Міхайлавіч,** н. у 1906, партызан Мазырскага атрада, загінуў 19.6.1943 у в. Міхнавічы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

**ВЯРАКСІЧ Дзяніс Рыгоравіч,** н. у 1922, партызан злучэння А. Іванова, загінуў 13.7. 1944 у Валынскай вобл.

**ВЯРАКСІЧ Нікіфар Міхайлавіч,** н. у 1906, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, памёр ад хваробы 19.1.1944.

**ГРАМОВІЧ Аляксандр Герасімавіч,** н. у 1904, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у разведцы 10.4.1943.

### ВЁСКА ЖАХАВІЧЫ

**ПАЗНЯК Мяфодзій Паўлавіч,** н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, закатаваны украінскімі нацыяналістамі ў 1943 у Валынскай вобл.

**ТКАЧ Кандрат Радзівонавіч,** н. у 1910, настаўнік, партызан Мазырскага атрада і падпольшчык, расстраляны ў ліпені 1942 у г. Мазыр.

**ШАХЛЕВІЧ Антон Давыдавіч,** н. у 1906, старшыня калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 23.12.1943.

### ВЁСКА ЛЕШНЯ

**БАКАВЕЦ Арцём Іванавіч,** н. у 1914, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

**БАКАВЕЦ Мікалай Ісакавіч,** н. у 1918, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак 1.6.1944.

**БРЭЎКА Уладзімір Аляксандравіч,** н. ў 1908, машыніст паравоза, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 10.5.1944 у Львоўскай вобл.

**ГРАМОВІЧ Аляксандр Дзмітрыевіч,** н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

**ДУБАВЕЦ Рыгор Дзмітрыевіч,** н. у 1908, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у жніўні 1943.

**ДУБАВЕЦ Уладзімір Цімафеевіч,** н. у 1920, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у жніўні 1943.

**ДЗЯЦЕЛ Іван Лявонавіч,** н. у 1925, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у студзені 1943, пахаваны ў в. Картынічы Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

**МІЦУРА Іосіф Міронавіч,** н. у 1923, настаўнік, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1943.

### ВЁСКА НАДАТКІ

**ІЛЬЮК Міхаіл Мацвеевіч,** н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у г. Высоцк Ровенскай вобл.

**ПАЛЯШЧУК Сямён Ціханавіч,** н. у 1919, партызан злучэння А. Сабурава, прапаў без вестак у 1944.

### ВЁСКА РУДНЯ СКРЫГАЛАЎСКАЯ

**РАЖАЛОЎСКІ Іван Міхайлавіч,** н. у 1922, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 4.9.1943 у в. Хлупяны Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл.

### ВЁСКА СКРЫГАЛАЎ

**БАЧЭЎСКАЯ Ніна Ільінічна,** н. у 1921, партызанка злучэння А. Сабурава, прапала без вестак у снежні 1942 у Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл.

**МАЙКОВА Вольга Міхайлаўна,** н. у 1922, партызанка злучэння А. Фёдарава, загінула 20.3.1943 у в. Ніцы Валынскай вобл.

**ПАДЗІЛА Павел Сцяпанавіч,** н. у 1911, аграном МТС, партызан 130-й Петрыкаўскай брыгады, загінуў 13.7.1943.

**ПРАЦЭНКА Уладзімір Іванавіч,** н. у 1926, камандзір разведгрупы злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Заходняй Украіне.

**ПРЫХОДЗЬКА Іван Іосіфавіч,** н. у 1920,



Ф. А. Клімчанка

партызан злучэння С. Каўпака, загінуў восенню 1942 у Хойніцкім р-не Гомельскай вобл.

**ПРЫХОДЗЬКА Уладзімір Мікітавіч,** н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 7.6.1944 каля в. Гарай Львоўскай вобл.

### ВЁСКА ЯСЕНЕЦ

**ПІСАНІК Васіль Апанасавіч,** н. у 1912, партызан атрада імя Будзённага, загінуў у 1943 у Валынскай вобл.

## СЛАБАДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА БУДА КАЗІМІРАЎСКАЯ

**ГЛУХАТАРЭНКА Уладзімір Фёдаравіч,** н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у 1943.

### ВЁСКА ВЯЛІКІЯ ЗІМОВІШЧЫ

**ЗУБРЫЦКІ Уладзімір Рыгоравіч,** н. у 1926, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 3.4.1944 у в. Завідуў Львоўскай вобл.

**КЛІМЧАНКА Фядос Антонавіч,** н. у 1915, працаваў старшынёй калгаса, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў 1943.

### ВЁСКА КАЗІМІРАЎКА

**ДЗЕМІДЗЕНКА Іван Парфенавіч,** н. у 1917, настаўнік, расстраляны за сувязь з партызанамі і падпольную дзейнасць у пачатку лютага 1942.

**КАМЕНСКІ Фёдар Апанасавіч,** н. у 1893, старшыня сельсавета ў Калінкавіцкім р-не, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў студзені 1942.

**ЛАГОЎНІК Іван Іванавіч,** н. у 1900, старшыня Баброўскага сельсавета, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў 1942.

**ЛУЗАН Лявон Савіч,** н. у 1909, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у верасні 1943.

**ПАДЛОБНІКАЎ Павел Васілевіч,** н. у 1910, настаўнік, партызан Мазырскага атрада, загінуў у лістападзе 1942.

**РАДАЎНЯ Аляксандр Фёдаравіч,** н. у 1914, партызан злучэння А. Сабурава, памёр ад ран у жніўні 1944.

**ТУРКО Міхаіл Аляксандравіч,** н. у 1923, партызан атрада імя Чапаева 1-й Карэльскай партызанскай брыгады, загінуў 20.8.1942 у Мядзведжагорскім р-не, Карэлія.

**ЧУБ Максім Мікалаевіч,** н. у 1895, старшыня Казіміраўскага сельсавета, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў студзені 1942 у г. Мазыр.

### ВЁСКА МАЙСЕЕЎКА

**КОЗЕЛ Аляксандр Сяргеевіч,** н. у 1903, партызан Мазырскага атрада, загінуў 7.7.1943, пахаваны ў в. Колкі Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

**ПАДАЛЯК Трафім Сцяпанавіч,** н. у 1918, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 30.7.1943 у в. Заліўе Ракітнянскага р-на Валынскай вобл.

### ВЁСКА МАЛЫЯ ЗІМОВІШЧЫ

**АСТАПЕНКА Максім Міхеевіч,** н. у 1916, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 7.6.1943 у в. Гарай Житомірскай вобл.

**КОЛАС Мітрафан Пятровіч,** н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 30.8.1943 у в. Шчакатава Мазырскага р-на.

**КОЛАС Навум Сцяпанавіч,** н. у 1912, партызан, загінуў 22.4.1944 у в. Будзячаў Валынскай вобл.

### ВЁСКА РАМАНАЎКА

**ЛУПІНА Пётр Сямёнавіч,** н. у 1927, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, працаваў у органах НКУС пасля вызвалення раёна, загінуў у баі з нацыяналістамі 13.10.1944, пахаваны ў в. Лапачы Валынскай вобл.

**ЛУПІНА Сямён Кандратавіч,** н. у 1890, партызан Мазырскага атрада, расстраляны зімой 1942.

### ВЁСКА РУДНЯ КАМЕНСКАЯ

**ШЧЫПЕР Арцём Цімафеевіч,** н. у 1896, старшыня калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 10.1.1944.

### ВЁСКА СЛАБАДА

**БАНДАРЭНКА Аляксандр Міхайлавіч,** н. у

1912, партызан Мазырскага атрада, паранены ў красавіку 1943, захоплены ў палон і закатаваны.

**ГАНЕЦКІ Павел Іванавіч,** н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 21.6.1943.

**ГАНЧАР Дзям'ян Пятровіч,** н. у 1908, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у лістападзе 1943.

**ГАНЧАР Сцяпан Пятровіч,** н. у 1913, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, паранены ў жніўні 1943, захоплены ў палон і закатаваны.

**ГАНЧАР Яўхім Трафімавіч,** н. у 1906, партызан, загінуў 21.5.1944.

**ГНЕДЗЬКА Дзяніс Максімавіч,** н. у 1901, старшыня калгаса, партызан Мазырскага атрада, расстраляны ў студзені 1943.

**ГНЕДЗЬКА Ігнат Фёдаравіч,** н. у 1924, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у 1944 у Валынскай вобл.

**ГРАМОВІЧ Аляксандр Дзмітрыевіч,** н. у 1920, бухгалтар калгаса, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 12.1. 1944.

**ДАШКЕВІЧ Сцяпан Рыгоравіч,** н. у 1927, партызан, загінуў у 1943.

**КАЛЕСНІК Максім Мікалаевіч,** н. у 1917, партызан злучэння А. Сабурава, памёр ад ран 20.2.1944 у Маскве.

**КЛІМЧАНКА Васіль Лук'янавіч,** н. у 1912, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў у маі 1944 у Польшчы.

**КЛІМЧАНКА Ілья Іванавіч,** н. у 1909, працаваў у органах НКУС, партызан злучэння С. Каўпака, загінуў у 1943 у Шапятоўскім р-не Вінніцкай вобл.

**КРАСЮК Андрэй Паўлавіч,** н. у 1913, працаваў у органах НКУС, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 4.9.1943, пахаваны ў в. Хлупляны Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл.

В. Л. Клімчанка



**ЛАХАНСКІ Канстанцін Рыгоравіч,** н. у 1910, партызан атрада «За свабоду славян» Пінскага злучэння, павешаны ўкраінскімі нацыяналістамі летам 1943 у Брэсцкай вобл.

**МІСЕВІЧ Андрэй Іванавіч,** н. у 1904, партызан атрада імя Фурманава Валынскага злучэння, загінуў 27.5.1943 у Валынскай вобл.

**НЕСЦЯРЧУК Васіль Паўлавіч,** н. у 1915, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, прапаў без вестак у 1943.

**РУХЛО Павел Арцёмавіч,** н. у 1918, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у лістападзе 1943.

**СІЛІЧ Сяргей Кірылавіч,** н. у 1903, партызан злучэння А. Сабурава, загінуў 5.9.1943, пахаваны ў в. Хлупляны Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл.

**СІТНІК Міхаіл Іванавіч,** н. у 1905, пар-




Помнік партызанам у в. Раманаўка

тызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 13.7.1943.

**СІТНІК Яўхім Данілавіч,** н. у 1901, старшыня Скрыгалаўскага сельсавета, член падпольнай арганізацыі і партызан Мазырскага атрада, расстраляны 20.1.1943 у г. Мазыр.

**ТУРБАЛ Дзяніс Нікіфаравіч,** н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 24.9.1943, пахаваны ў в. Раманаўка Мазырскага р-на.

**ТУРЧЫН Аркадзь Якаўлевіч,** н. у 1910, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у кастрычніку 1943.

**ШАСТАКОЎСКІ Аркадзь Раманавіч,** н. у 1910, партызан, загінуў у 1943 у г. Высоцк Ровенскай вобл.

**ШАЎЦОЎ Барыс Аўрамавіч,** н. у 1908, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у верасні 1943 на чыгунцы ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл.

### ВЁСКА ХАМІЧКІ

**НІКІЦЕНКА Міхаіл Васілевіч,** н. у 1926, партызан 125-й Капаткевіцкай брыгады, загінуў у 1943.

М. І. Сітнік



### ВЁСКА ЧАРАМАШНЯ

**ГАФШТЭЙН Шолам Меeравіч,** н. у 1893, старшыня калгаса, партызан Мазырскага атрада, закатаваны ў 1941 у в. Каменка Мазырскага р-на.

Па матэрыялах архіваў Беларусі, Украіны, Малдовы спіс падрыхтаваў

*М. Капач*

## Вызваленне

Восенню 1943 г. войскі Цэнтральнага фронту (у кастрычніку 1943 г. перайменаваны ў Беларускі) выйшлі да Дняпра. Злучэнні 65-й арміі ў выніку паспяхова праведзенай аперацыі фарсіравалі Днепр у раёне Лоева, захапілі шэраг плацдармаў.

26 лістапада пасля ўпартых баёў нашы войскі авалодалі Гомелем, вызвалілі першы абласны цэнтр Беларусі. Набліжаўся час вызвалення Мазыра. Была распрацавана аперацыя, якая ўвайшла ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны як Калінкавіцка-Мазырская.

Задача на правядзенне яе была пастаўлена камандаваннем фронту 2 студзеня 1944 г. (камандуючы — генерал арміі К. К. Ракасоўскі, член Ваеннага савета — генерал-лейтэнант К. Ф. Цялегін, начальнік штаба — генерал-палкоўнік М. С. Малінін). На падрыхтоўку аперацыі адводзілася пяць сутак. Ва ўмовах лясіста-балоцістай мясцовасці і бездарожжа асаблівае значэнне набывалі камунікацыі. Гітлераўскае камандаванне прыняло ўсе меры для ўмацавання сваёй групоўкі. Калінкавіцкаму чыгуначнаму і шасэйным вузлам, абласному цэнтру Мазыру яно надавала выключнае значэнне. Абарону трымалі 9 пяхотных і 2 танкавыя дывізіі, 3 дывізіёны штурмавых гармат, кавалерыйскі полк і іншыя часці. Былі пабудаваны даўгачасныя абаронныя збудаванні, дзоты, лініі траншэй, мясцовасць была густа замініравана.

Калінкавіцка-Мазырская аперацыя ажыццяўлялася войскамі дзвюх армій: 65-й (камандуючы — генерал-лейтэнант П. І. Батаў, член Ваеннага савета — генерал-маёр Н. А. Радзецкі, начальнік штаба — генерал-маёр М. В. Бабкоў) і 61-й (камандуючы — генерал-лейтэнант П. А. Бялоў, член Ваеннага савета — генерал-маёр Д. Г. Дуброўскі, начальнік штаба — генерал-маёр А. Д. Пулко-Дзмітрыеў). У склад 65-й арміі быў уключаны 1-шы гвардзейскі Данскі танкавы корпус пад камандаваннем генерал-маёра М. Ф. Панова.